ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ВИТЕБСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

# РАШЭННЕ

# РЕШЕНИЕ

23 чэрвеня 2021 г. № 328

г. Віцебск

г. Витебск

Аб наданні статусу і катэгорыі гісторыка-культурнай каштоўнасці

На падставе падпункта 1.1 пункта 1 і пункта 7 артыкула 93, падпункта 4.1 пункта 4 артыкула 96 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, рашэння Віцебскага абласнога савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны ад 4 чэрвеня 2021 г. (пратакол № 6) Віцебскі абласны выканаўчы камітэт РАШЫЎ:

1. Надаць нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці – ”Помнік Я.П.Кульневу“ (датаванне каштоўнасці – 1830 г.), размешчанай у Полацкім раёне ля в. Лісуны, 4 км на паўночна-паўночны захад ад вёскі, на левым беразе р. Дрыса на месцы былой Сівошынскай пераправы, 0,5 км на захад ад аўтадарогі Р-46 ”Лепель – Полацк – мяжа Расійскай Федэрацыі (Юхавічы)“, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю ”3“.

2. Надаць нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці – ”Сядзібна-паркавы комплекс Цюндзявіцкіх: рэшткі сядзібнага дома, рэшткі флігеля і дзвюх гаспадарчых пабудоў, фрагменты парку“ (датаванне каштоўнасці – канец XIX ст.), размешчанай у Талачынскім раёне ў в. Галошава на вул. Школьнай, статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыю ”3“.

3. Полацкаму і Талачынскаму раённым выканаўчым камітэтам у месячны тэрмін:

3.1. арганізаваць падпісанне ахоўных абавязацельстваў;

3.2. забяспечыць падрыхтоўку пашпартоў на дадзеныя гісторыка-культурныя каштоўнасці.

4. Кантроль за выкананнем гэтага рашэння ўскласці на начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.

Старшыня М.М.Шарснёў

РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ ВИТЕБСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПРОТОКОЛЬНАЯ ЧАСТЬ город Витебск

Кіраўнік спраў А.У.Сысоеў

Падгурскі 48 22 06